его психологическую структуру. Однако следует всегда помнить высказанную А. Швейцеромистину, о том, что «воля к жизни есть воля к осуществлению идеалов»[1].

Рассматривая систему этноконфессиональных отношений, следует признать, что она позиционирует себя как целостность, включает интегральное единство культурного и психического, сознательного и бессознательного, черты склада ума и мышления, психики и образа поведения, реакции на внешние воздействия. Этнорелигиозная идентичность наполнена социальными и культурными богатствами, духовными и нравственными началами, что важно для поликонфессионального общества, сохранения его единства в многообразии.

Завершая статью, отметим, что этнорелигиозное ныне по-новому манифестирует себя, содержит историю, служит настоящему, прокладывает пути в будущее, определяет характер развития общества, влияет на формы жизнедеятельности, адекватные существующей культуре и духовности. Она опирается на свои базовые ценности, мораль, нормы. Сегодня объективная реальность, наша повседневность в немалой степени является творением этнорелигиозной идентичности человека, связана с характером его жизни и деятельности, культурой и общими ценностями.

## З'ЯЎЛЕННЕ ВАЛЬДЭНСАЎ У ПОЛЬШЧЫ: ПЫТАННЕ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ

*А. В. Валодзіна*
Мінск, Беларусь

Вальдэнсы на тэрыторыі сучаснай Польшчы з’яўляюцца адносна рана, менш чым праз стагоддзе пасля першай пропаведзі Вальдо (70-я гг. XII ст.). Праўда, звесткі пра іх тут даволі ўскосныя, і ўтрымліваюцца ў буле Папы Рымскага Аляксандра IV ад 17 красавіка 1257 г.[2].

*Бо адкуль у некаторых частках каралеўства і валадарства найдаражэйшага сына нашага ўва Хрысце Святлейшага Караля*

---

[1] *Швейцер, А.* Благоговение перед жизнью как основа этического миро- и жизнеутверждения / А. Швейцер // Глобальные проблемы и общечеловеческие ценности. – М., 1990. – С. 328–350.

[2] *Boček, A.* Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae / A. Boček // V. III. – Olomouc, 1841. – S. 238.

*Багеміі і памежных польскіх землях*[1] *памылкі няверʼя ўзмацніліся настолькі, што многія адхіліліся ад шляху ісціны ў адваротным кірунку для памылковай аддаленасці, што можа прывесці да гібельнага расшатвання муру артадаксальнай веры.*

Сама була не называе секту, але некаторыя даследчыкі выказваюць меркаванне, што гэта былі адгалоскі руху, вядомага на тэрыторыі Чэхіі з 1244 г.[2] Дакладна вядома, што ў гэты час секта была распаўсюджана на тэрыторыях сучаснай Германіі і Аўстрыі, магчыма, сам Вальдо памірае на ўсходзе Еўропы падчас сваей вандроўкі разам з верным спадарожнікам Віветам ў Багемію прыкладна ў 1217 г.[3]

Наступны раз неідэнтыфікаваныя ерэтыкі заўважаны на тэрыторыі Польшчы ў сувязі з дзейнасцю вроцлаўскага біскупа Генрыка ў 1314–1315 гг. Адразу ў двух аналах мы маем спасылку на спаленне ерэтыкоў у 1315 г. у падначаленым яго юрысдыкцыі горадзе Свідніцы.

Вытрымкі з аналаў:

| **ANNALES LUBENSES**[4] | **ANNALES CISTERCIENSIUM IN HEINRICHOW**[5] |
|---|---|
| *У лета Божае 1315 каля дня свята святога Іакава*[6] *многія ерэтыкі колькасцю каля пяцідзесяці ці больш, разам са сваімі жонкамі і дзецьмі, былі спаленыя ў Свідніцы; ва Вроцлаве і іншых гарадах таксама многія былі спалены.* | *У лета Божае 1315 у Сілезіі: у Свідніцы, у Вроцлаве і ў іншых месцах было спалена мноства ерэтыкоў.* |

[1]Фармуліроўка «на польскім памежжы» («Regis Boemorum et Polonie confiniis») можа мець 2 пераклады з лаціны: «на тэрыторыі Польшчына памежжы з Чэхіяй і «ў Чэхіі на мяжы з Польшчай».

[2] *Palacký, Fr.* O stycich a pomeru sekty waldenske k nekdeisim sektam w cechach / Fr. Palacký. – Casopis Musea král Ceského, 1868. – S. 294–295.

[3] *Blair, A.* History of the Waldenses: with an introductory sketch of the history of the Christian Churches in the south of France and north of Italy, till these churches submitted to the pope, when the Waldenses continued as formerly independent of the papal see / A. Blair. – Edinburgh, 1832. – P. 256; *Comba, E.* Storia dei valdesi / E. Comba. – Torre Pellice (Torino): Libreria Editrice Claudiana, 1950. – P. 47.

[4] *Arndt, W.* Annales Lubenses / W. Arndt // MGH SS. – 1866. – S. 548–549.

[5]Breve chronicon Silesiae // Scriptores Rerum Silesiacarum; hg. von G. A. Stenzel. Bd. 1. – Breslau, 1835. – P. 33–37.

[6] Прыкладна 25 ліпеня 1315 г.

У тым жа 1315 г. у Свідніцы па антыерэтычнай справе быў склікаены трыбунал у складзе дамініканцаў, францысканцаў і прадстаўнікоў свецкіх уладаў пад кіраўніцтвам памочніка вроцлаўскага біскупа Паўла з Банча. Сярод абвінавачаных сустракаліся нават жанчыны. Па яго выніках не менш за чатыры чалавекі былі адпраўлены на вогнішча. Яшчэ адным распаўсюджаным у той час пакараннем была канфіскацыя маемасці і выгнанне[1].

Прыкладна ў гэты час і пачынае свае існаванне інквізіцыя на тэрыторыі польскай Сілезіі. Абставіны прызначэння інквізітараў, а таксама іх імены мы можам знайсці ў лістах Папы Рымскага Іаана XXII вроцлаўскаму біскупу Генрыку, змешчаных у Сілезскім дыпламатычным кодэксе[2]. Шэраг гэтых булаў не маюць дакладнай даціроўкі, але можна меркаваць, што напісаныя яны ў 1315 г. або непасрэдна пасля яго.

У гэтых булах ізноў жа не сустракаецца найменне «вальдэнсы», гаворка ідзе проста пра «ерэтыкоў»[3].

У 1318 г. ўсе яшчэ неідэнтыфікаваныя ерэтычныя рухі распаўсюджаны ўжо на біскупствы Міснійскае, Аламоўцкае, Пражскае, Вроцлаўскае і Кракаўскае[4].

Далей колькасць інквізітараў толькі павялічвалася – чытаем булу ад 1326–1937 гг.[5], і іх дзейнасць ахоплівала амаль усю Польшчу (гаворка ідзе не пра канкрэтныя біскупствы, а пра *«Каралеўства Польшча»* агулам).

У булах Папы Рымскага ад 1327 і 1330 гг. пішацца, што ерэтыкі пранікалі на тэрыторыю каралеўства Венгрыя з Германіі і Польшчы (адпаведна, у Славакію з Малапольшчы). Інквізітар ў Кракаве ўзгадваецца і пад 1350 г.[6].

---

[1] *Kotełko, S.* Śridniowieczne herezje w Świdnicy / S. Kotełko. – Режим доступа: http://um.swidnica.pl/media/Encyklopedia/czescV.pdf. – S. 2.

[2] Codex Diplomaticus Silesiae. T. 5 Das Formelbuch des Domherrn Arnold von Protzan. – Breslau, 1862. – S. 40–41; 49–50; 54–57; 80–83.

[3] *Chytil, J.* Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae / J. Chytil. V. VI. – Brno, 1854. – S 104.

[4] *Propago, D.* Hyacinthi thavmatvrgi Poloni, seu De rebus praeclare gestis in Prouincia poloniae Ordinis Praedicatorum commentarivs / D. Propago, A. Bzowski. Venetiis: apud Societatem Minimam. – 1606. – S. 62–63.

[5] *Propago, D.* Hyacinthi thavmatvrgi Poloni… / D. Propago. – S. 69.

[6] *Ogórek, M.* Przyczajonywaldens, ukrytykatar /M. Ogórek. – Режим доступа: http://historia.focus.pl/swiat/przyczajony-waldens-ukryty-katar-1012. – S. 1.

Вызначыць прыналежнасць вышэйзгаданых ерэтыкоў да нейкай канкрэтнай ерэтычнай секты дастаткова складана. Найбольш верагоднымі кандыдатамі выступаюць, найперш, вальдэнсы і бегінкі/бегарды або Браты Вольнага Духу як найбольш распаўсюджаныя ў дадзены перыяд на тэрыторыі Чэхіі, Аўстрыі і Германіі. Другі варыянт малаверагодны, бо якраз яны ў булах звычайна называюцца канкрэтна, таму напрацягу доўгага часу сярод навукоўцаў панаваў падыход да гэтых сектаў выключна як да вальдэнскіх. Хаця ў апошні час польскай даследчыцай Магдаленай Огурэк было выказана меркаванне пра прыналежнасць гэтых спаленых ерэтыкоў з Любяжскіх аналаў, а таксама тых, хто цярпеў пераслед біскупа Генрыка, да катараў. У доказ прыводзіцца цытата нейкага вальдэнса Энгільмара *«есць іншая група (gens), горшая за нас, якая не есь мяса».* На вялікі жаль, у артыкуле адсутнічае спасылка на крыніцу паходжання цытаты, таму гэта можа застацца толькі гіпотэзай.

Першы раз узгадка менавіта вальдэнсаў на тэрыторыі Польшчы сустракаецца ў гісторыка XVI ст. Флацыўса Ілірыўса (1520–1575) у яго манументальным трактаце «Каталог тэкстаў ісціны» (Catalogus testium veritatis) ст. 719–720[1]:

*Тыя ж (вальдэнсы), якія накіраваліся ў Ламбардыю, многія былі даведзены да смерці выказваннямі сваей ісціннай рэлігіі, і іх дактрына шырока распаўсюдзілася. Бо па ўсей Італіі, а таксама Сіцыліі іх догма настолькі пашырылася, што імператар Фрыдрых II выдаў супраць іх закон. Таксама ж у Германіі, а асабліва ў Эльзасе і ў наваколлях Рэйна, а таксама ў Багеміі, а адтуль далей ў Саксонію, Сілезію, Маравію і Польшчу дактрына іх перад 300-мі гадамі пашырылася. Бо ў Ламбардыі ў іх была школа або акадэмія ісціннай тэалогіі Хрыста. Усе гэта мы можам даведацца са старых інквізіцыйных кніг.*

*Інквізіцыя ў Багеміі і Польшчы супраць вальдэнсаў была ўсталявана каля 1330 года Господняга, калі былі сабраныя красамоўныя звесткі, што яны маюць звычку зносіцца з братамі з Ламбардыі, а таксама інквізіцыяй было выкрыта, што для навучання тэалогіі з Багеміі накіроўваюцца да сваіх папярэднікаў вальдэнсаў у Ламбардыю, у тую школу ці акадэмію.*

---

[1] *Flacius, M.* Catalogus testium Veritatis / M. Flacius. – Режим доступа: http://www.uni-mannheim.de/mateo/camenahist/autoren/flacius_hist.htm.

У іншым творы ў таго ж аўтара мы сустракаем наступную згадку[1]:

*У мяне есць інквізітарскія кнігі, напісаныя да 300-ых гг., у якіх паведамляецца, што вучэнне секты вальдэнсаў было распаўсюджана ў Багеміі, Саксоніі, Сілезіі і Польшчы, і гэта вучэнне мела паходжанне з Ламбардыі і цызальпійскай Галіі. Тады ў Багеміі мелі звычку збіраць маемасць і пасылаць братоў вучняў для пераймання ў школу тэалогіі.*

Хутчэй за ўсе звесткі аўтар атрымаў з матэрыялаў допытаў Шчэцынскага інквізіцыйнага трыбуналу (гл. ніжэй), частку з якіх ен першы апублікаваў.

Мы маем звесткі пра дзейнасць у 30-ых гг. у Вроцлаве па загаду біскупа Нанкера інквізітара-дамініканца Яна з Швенкенфельду (ваколіцы Свідніцы), які разгарнуў акцыю як супраць канкрэтных асобаў Пятра Піранэнсіса (таксама вядомы як Петр, сын Яна з Алівы) і Іанна Лютцэбургена, так і супраць руху бегінак у цэлым[2].

Вучэнне вышэйадзначанага Пятра канкрэтызуе у сваей «Царкоўнай гісторыі» 1590 г. Абрахам Броўскі (крыніцай гэтаму мог служыць каментар да Апакаліпсісу аўтарства самога Пятра, выдадзены пазней Ігнацам фон Дзёлігенрам). Ерэсіярх называе Рым Вавілонам, Рымскую Царкву – сінагогай Сатаны, а Папу – Антыхрыстам. Евангеллі, з яго пункту гледжання, трэба было разумець літаральна, і крыж таксама не меў ніякага сімвалічнага напаўнення. Некаторыя аўтары схільны бачыць у гэтым заявах вальдэнскі ўплыў[3], хоць яны і былі характэрны для многіх ерэтычных цячэнняў таго часу. Антыклерыкальныя выступленні вроцлаўскіх мяшчанаў пад кіраўніцтвам нейкага Марціна, збеглага манаха-цыстэрцыянца з Грэноблю, праходзілі таксама пад лозунгамі, падобнымі да вальдэнскіх: дазвол прымаць споведзь несвятару, запрашэнне вандроўных святароў, ігнараванне царкоўнага адлучэння. Але гэта таксама пазнейшая канкрэтызацыя назвы ерэтычнага руху.

---

[1] *Palacký, Fr.* O stycich a pomeru sekty waldenske k nekdeisim sektam w cechach / Fr. Palacký. – Casopis Musea král Ceského, 1868. – S. 301–302.

[2] *Bzowski, A.* Tutelaris Silesiae seu de vita rebusque praeclare gestis B. Ceslai Oorovansii, ordinis Praedicatorum commentarius / A. Bzowski. – Cracoviae, 1608. – S. 27.

[3] *Dobrowolski, K.* Pierwsze sekty religijne w Polsce / K. Chodynick // Reformacja w Polsce. – Warszawa: Polska Składnica Pomocy Szkolnych, 1921. – S. 184.

У 1380 г. была праведзена ў дыяцэзіях Пражскай, Лютамержскай і Аламоўцкай акцыя супраць «тых асуджаных сялян-вальдэнсаў», якая распаўсюдзілася і на Сілезскія землі[1].

Найважнейшае значэнне для вывучэння гісторыі вальдэнсаў Польшчы мае спіс міністраў секты вальдэнсаў 1391 г., напісаны прыерам камінскіх цэлесцінцаў Пятром Цвікерам у 1393–1394 гг.: «*У годзе Божым 1391, 4 верасня, ніжэйзапісаныя былі рэктарамі секты вальдэнсаў: першы Мікалай з Польшчы, таксама Ян з Польшчы, сын нейкага селяніна, ...* [далей яшчэ 10 іменаў сялян і рамеснікаў з Германіі і Венгрыі]. *Сярод іх былі апосталы, магістры і браты*». Палякі ў гэтым спісе запісаны ў міністры (рэктары). Якія былі іх абавязкі – сказаць цяжка. Можна толькі выказаць меркаванне, што гэта былі вандроўныя прапаведнікі, як і ў італьянскіх і французскіх вальдэнсаў. Але сам факт іх існавання сведчыць пра сталую традыцыю вальдызму на польскіх (назва «Сілезія» ў дакуменце не сустракаецца) землях[2].

Свае дасканалыя веды Петр атрымай падчас сваёй актыўнай інквізіцыйнай дзейнасці ў Цэнтральнай Еўропе: ад Балтыйскага мора да Аўстрыйскіх Альпаў. За гады вышуку ім было апытана больш за 15 000 нямецкамоўных ерэтыкоў-вальдэнсаў[3]. Паміж 1392 і 1394 гг. ен узначальваў інквізіцыйны трыбунал у польскім горадзе Шчэцыне (Паморʼе). Падчас вядзення працэсу было выкрыта і выклікана на допыт 443 вальдэнсы. Адметна, што па выніках быў вынесены толькі адзін смяротны прысуд, астатнія вярнуліся (або зрабілі выгляд) у лона каталіцкай царквы. Цікавасць выклікае не толькі колькасць вальдэнсаў у Памераніі напрыканцы XIV ст., але і даўнасць іх поглядаў – адна васьмідзесяцігадовая арыштаваная засведчыла свой удзел у секце з семнаццаці гадоў[4], а гэта значыць з 20-ых гг. XIV ст., што

[1] *Döllinger von, I.* Beiträge zur Sektengeschichte des Mittelalters / I. von Döllinger. – München, 1890. – S. 527–535.

[2] *Döllinger von, I.* Beiträge zur Sektengeschichte... / I von Döllinger. – S. 367–369.

[3] *Petreman, Ch.* Peter Zwicker: A Fair but Fervent German Inquisitor Petreman. – Режим доступа: https://www.academia.edu/7519093/Peter_Zwicker_A_Fair_but_Fervent_German_Inquisitor. – P. 1.

[4] *Rymar, E.* Waldensiz «kacerskich» okolic Chojnyw XIV–XV wieku / E. Rymar // Rocznik Chojenski: Pismo historyczno-spoleczne. – 2009. – V. 1. – S. 11.

ўскосна дае самую раннюю (з вядомых) дату з’яўлення вальдэнсаў у Паўночна-Заходняй Польшчы.

Маштабнасць прысутнасці вальдэнсаў на Польскіх землях, і, у прыватнасці, у Сілезіі напрыканцы XIV – пачатку XV стагоддзяў паказвае аналіз манускрыптаў з архіва Вроцлаўскага ўніверсітэта. Дамініканцы-інквізітары вызначанага перыяду мелі выдатную падборку антыерэтычных, у большасці сваей антывальдэнскіх, трактатаў[1]. Асаблівай увагі варта наяўнасць «Артыкулаў секты вальдэнсаў», запісаных у 1393 годзе інквізітарамі Марцінам Пражскім і вышэйадзначаным Пятром Цвікерам. Гэты тэкст з невялікімі рэгіянальнымі асаблівасцямі меў хаджэнне ў вялікім рэгіене Памор’я – Германіі – Аўстрыі – Чэхіі – Сілезіі. Артур Шыманьскі вылучае нават асобны ад нямецка-аўстрыйскага і пражскага сілезска-лужыцкі тып, што толькі падкрэслівае актуальнасць вальдэнскага пытання на тэрыторыі Польшчы ў вызначаны перыяд.

Такім чынам, прамыя звесткі пра існаванне вальдэнсаў на тэрыторыі Польшчы з’яўляюцца толькі ў апошняй трэці XIV стагоддзя. Абапірацца на сведчанні больш позніх аўтараў-вальдэнсаў нерацыянальна з-за іх імкнення зрабіць сваю гісторыю больш старажытнай і ўзвесці яе да часоў Апосталаў. Звесткі інквізітараў, запісаныя больш чым праз два стагоддзі пасля мяркуемых падзеяў, таксама можна прымаць толькі ў якасці ўскосных. Адзіным шляхам (акрамя пошуку новых крыніц) бачыцца аналіз вераванняў гэтых неідэнтыфікаванях ерэтыкоў (як было зроблена ў выпадку з Пятром Піранэнсісам) і супастаўленне іх з ужо вядомымі тагачаснымі вальдэнскімі тэзісамі з сумежных земляў.

## РАДИКАЛИЗАЦИЯ ИДЕИ САЛАФИЗМА И СОВРЕМЕННОЕ ОБЩЕСТВО

*Е. К. Агеенкова*
Минск, Беларусь

Наиболее серьезные процессы в настоящее время происходят в исламе – второй по количеству своих последователей среди

---

[1] Падрябязней гл. *Szymański, J.* «Articuli secte Waldensium» na tle antyheretyckich zbiorów rękopiśmiennych Biblioteki Uniwersytetu Wrocławskiego / J. Szymański, – Warszawa: WydawnictwoDiG, 2004. – S. 85–96.